8. **Старостенко, В. В.** Специфика конфессиональной структуры Гомельской области в контексте религиозной жизни Республики Беларусь / В. В. Старостенко // Итоги научных исследований ученых МГУ имени А. А. Кулешова 2016 г. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – С. 65–67.

9. Число религиозных организаций в Брянской области на 1 января 2020 г. [Электронный ресурс] // Территориальный орган Федеральной службы государственной статистики по Брянской области. – Режим доступа: https://bryansk.gks.ru/storage/mediabank/Религиозные%20организации.htm. – Дата доступа: 14.09.2021.

УДК 2 (476)

# РЭГІЯНАЛЬНАЯ СПЕЦЫФІКА СВЕДАК ІЕГОВЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

В. У. СТАРАСЦЕНКА
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
Магілёў, Беларусь

**Анатацыя**. Разглядаюцца сучасны стан і рэгіянальныя асаблівасці арганізацыі Сведкаў Іеговы ў Беларусі ў 1990–2000 гг.

**Ключавыя словы**: Сведкі Іеговы, Беларусь, рэгіён, канфесія.

Адна з актуальных тэм беларускага рэлігіязнаўства – «стан канфесій» і «канфесійнае раянаванне Беларусі» [3, с. 543].

Сведкі Іеговы – адна з найбольш неадназначна ўспрыманых арганізацый позняга пратэстантызму. Можа ставіцца таксама да катэгорыі маргінальнага хрысціянства, парахрысціянства, мілінарысцкіх дэнамінацый і інш. Спецыфіка веравучэння абумовіла супярэчлівае ўспрыманне іегавізму як у асяроддзі традыцыйнага хрысціянства, так і з боку шэрагу пратэстанцкіх напрамкаў. Існуюць складанасці ў дзяржаўна-канфесійных адносінах у шэрагу краін свету, што звязана з адмовай ад ваеннай службы, ад удзелу ў выбарах і грамадска-палітычнай дзейнасці, ад прызнання дзяржаўных свят і атрыбутыкі. Часта іх абвінавачваюць у грэбаванні жыццём у сілу адмовы ад пералівання крыві. Арганізацыя дзейнічае ў большасці краін свету, забаронена ў Кітаі і ў шэрагу іншых краін Азіі і Афрыкі. У красавіку 2017 г. Вярхоўны суд Расійскай Федэрацыі забараніў дзейнасць Кіраўніцкага цэнтра Сведкаў Іеговы ў Расіі і ўсіх яго рэгіянальных (395) аддзяленняў. У Саюзнай дзяржаве іх дзейнасць не абмежавана. У Рэспубліцы Беларусь Сведкі Іеговы маюць афіцыйную рэгістрацыю, хоць да іх неаднаразова выказваліся прэтэнзіі, перш за ўсё да формаў некультавай рэлігійнай дзейнасці (распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры па-за рамкамі культавых будынкаў). Тым не менш нормам свецкай дзяржавы [7] і нацыянальнай бяспекі [4] дзейнасць іегавістаў, пры ўсёй іх своеасаблівасці, непасрэдна не супярэчыць.

У сучаснай Беларусі абшчыны Сведкаў Іеговы вядомыя з 1991 г. (чатыры арганізацыі) [6, с. 6], рэгістрацыю першых абшчын адносяць да 1994 г. (у Мінску, Гомелі і Калінкавічах) [1, с. 76], у цяперашні час налічваецца 27 абшчын [6, с. 8], пры гэтым яшчэ каля 10 арганізацый, паводле звестак канфесіі, функцыянуюць нелегальна. Абшчыны аб'ядноўваюць да 6 тыс. вернікаў [1, с. 78]. Усе абшчыны ўваходзяць у склад рэспубліканскага аб'яднання «Рэлігійнага аб'яднання Сведкаў Іеговы ў Рэспубліцы Беларусь», аўтаномныя арганізацыі адсутнічаюць.

Сведкі Іеговы мелі высокую дынаміку развіцця ў 1990-х гг.: колькасць абшчын за 1992–2000 гг. павялічылася з 4 да 26, гэта значыць больш чым у 6 разоў, але пасля 2010 г. рост суполак спыніўся (мал. 1) [5]. Пры гэтым удзельная вага Сведак Іеговы ў агульным аб'ёме рэлігійных суполак Беларусі ў 2000-х гг. істотна не змянілася (каля 0,8 %) (табл. 1).




Мал. 1. Колькасць суполак Сведак Іеговы, якія рэгіструюцца па гадах (1991–2019 гг.) у Рэспубліцы Беларусь

Найбольшая колькасць зарэгістраваных абшчын (7) размешчана ў Гомельскай вобласці: Гомелі, Жлобіне, Калінкавічах, Мазыры, Рэчыцы, Рагачове, Светлагорску. Па пяць арганізацый дзейнічаюць у Віцебскай (у Віцебску, Навапалацку, Полацку, Оршы, Глыбокім) і Гродзенскай (у Гродне, Ваўкавыску, Навагрудку, Ашмянах і Смаргоні) абласцях, па тры – у Магілёўскай (у Магілёве, Бабруйску, Касцюковічах), Брэсцкай (у Брэсце, Баранавічах, Кобрыне) і Мінскай (Салігорску, Клецку, Жодзіна) абласцях, адна абшчына – у г. Мінску (мал. 2 і табл. 2).

Табл. 1. Удзельная вага суполак Сведак Іеговы ў агульным аб'ёме рэлігійных суполак у рэгіёнах Рэспублікі Беларусь на 1.01.2000 г., 1.01.2010 г. і 1.01.2020 г.

| Год | Колькасць рэлігійных суполак, % | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Брэсцкая вобл. | Віцебская вобл. | Гомельская вобл. | Гродзенская вобл. | Магілёўская вобл. | Мінская вобл. | Мінск | Па рэспубліцы |
| 2000 | 0,48 | 1,38 | 2,08 | 0,91 | 0,59 | 0,19 | 0,92 | 0,83 |
| 2010 | 0,42 | 0,96 | 1,89 | 1,10 | 0,78 | 0,46 | 0,74 | 0,84 |
| 2020 | 0,39 | 0,89 | 1,66 | 1,04 | 1,02 | 0,42 | 0,64 | 0,80 |




Мал. 2. Размеркаванне суполак Сведак Іеговы ў рэгіёнах Беларусі (на 1.01.2020 г.)

Табл. 2. Колькасць і адсоткавыя суадносіны суполак Сведак Іеговы ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь на 1.01.2000 г., 1.01.2010 г. і 1.01.2020 г.

| Год | Колькасць рэлігійных суполак | | | | | | | | Колькасць рэлігійных суполак, % | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Брэсцкая вобл. | Віцебская вобл. | Гомельская вобл. | Гродзенская вобл. | Магілёўская вобл. | Мінская вобл. | Мінск | Па рэспубліцы | Брэсцкая вобл. | Віцебская вобл. | Гомельская вобл. | Гродзенская вобл. | Магілёўская вобл. | Мінская вобл. | Мінск | Па рэспубліцы |
| 2000 | 3 | 5 | 6 | 4 | 1 | 1 | 1 | 21 | 14,29 | 23,81 | 28,57 | 19,05 | 4,76 | 4,76 | 4,76 | 100 |
| 2010 | 3 | 5 | 7 | 5 | 2 | 3 | 1 | 26 | 11,54 | 19,23 | 26,92 | 19,23 | 7,69 | 11,54 | 3,85 | 100 |
| 2020 | 3 | 5 | 7 | 5 | 3 | 3 | 1 | *27* | 11,11 | 18,52 | 25,93 | 18,52 | 11,11 | 11,11 | 3,70 | 100 |

Па стане на 1 студзеня 2020 г. абшчыны мелі тры (два ў Віцебскай і адзін у Гродзенскай абласцях) культавыя будынкі («Залы царства») на правах уласнасці [2, с. 585], у іншых выпадках выкарыстоўваліся магчымасці арэнды. У абшчынах святарскія абавязкі выконвалі 36 служыцеляў культу (11 – у Гомельскай, 7 – у Мінскай, 6 – у Віцебскай, 5 – у Гродзенскай, па 3 – у Брэсцкай і Магілёўскай абласцях, 1 – у г. Мінску).

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Дьяченко, О. В.** Сущность и тенденции развития иеговизма в современной Беларуси / О. В. Дьяченко // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2018. – № 2 (52). – С. 76–81.

2. **Пушкин, И. А.** Национально-конфессиональные отношения / И. А. Пушкин, В. В. Старостенко // История белорусской государственности: в 5 т. – Минск: Беларус. навука, 2020. – Т. 5: Национальная государственность на переломе эпох (вторая половина XX – начало XXI в.). – С. 550–589.

3. **Старостенко, В. В.** Актуальные проблемы современного религиоведения в Беларуси / В. В. Старостенко // Национальная философия в глобальном мире: тез. Первого Белорус. филос. конгресса. – Минск : Беларус. навука, 2017. – С. 542–543.

4. **Старостенко, В. В**. Национальная безопасность и конфессиональная сфера Республики Беларусь / В. В. Старостенко // Проблемы обеспечения национальной и региональной безопасности: правовые и информационные аспекты: в 2 т. – Минск: Ин-т нац. безопасности Респ. Беларусь, 2018. – Т. 1. – С. 296–299.

5. **Старостенко, В. В.** Институциализация и динамика развития организации Свидетелей Иеговы в Республике Беларусь / В. В. Старостенко // Религия и общество – 15: сб. науч. ст. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2021. – С. 145–148.

6. **Старостенко, В. В.** Религии в Республике Беларусь в статистическом измерении: справочник / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2021. – 144 с.

7. **Старостенко, В. В.** Свобода совести и светское государство / В. В. Старостенко // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2018. – № 1 (51). – С. 37–41.